

# Яўгенія Сяргееўна УМЕЦКАЯ

**(17.02.1926–24.03.2016)**

24 сакавіка 2016 г. трагічна загінула Яўгенія Сяргееўна Умецкая, беларускі кнігазнаўца, вучоны, педагог. І вось... замест віншаванняў з 90-гадовым юбілеем – некралог...

Нарадзілася Яўгенія Сяргееўна 17 лютага 1926 г. у Гомелі. У 1940 г., скончыўшы сямігодку, паступіла ў Гомельскае педагагічнае вучылішча. Калі пачалася вайна, яна разам з сям'ёй адправілася ў далёкую эвакуацыю на Алтай, куды быў накіраваны ваенны шпіталь, у якім працаваў бацька, Сяргей Панькоў. Нягледзячы на вялікія цяжкасці, што выпалі на долю сям'і, Яўгеніі ўдалося ў 1943 г. скончыць дзесяць класаў, а ў 1944 г. дзякуючы выдатным адзнакам за першы курс Гомельскага педагагічнага вучылішча яна без экзаменаў была залічана на гісторыка-філалагічны факультэт Бійскага дзяржаўнага настаўніцкага інстытута.

У 1945 г. пасля заканчэння вайны сям'я Панькових вярнулася назад у Беларусь. Яўгенія ж зрабіла канчатковы выбар, паступіўшы на другі курс нядаўна створанага бібліятэчнага факультэта ў Мінскім педагагічным інстытуце. У 1948 г. пасля заканчэння вучобы атрымала дыплом выдатніка па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства». Ёй была прысвоена кваліфікацыя «бібліятэказнаўца і выкладчык бібліятэчнай справы ў тэхнікумах».

З гэтага часу яе працоўная дзейнасць была звязана з бібліятэчнай справай: у Гомельскай абласной бібліятэцы (да 1963 г.), у Фундаментальнай бібліятэцы Акадэміі навук БССР (да 1971 г.). У 1972 г. распачаўся новы этап – выкладчыцкая праца ў Мінскім педагагічным інстытуце, а з 1975 г. – у Мінскім інстытуце культуры.

Грунтоўная і мэтанакіраваная навуковая дзейнасць Я.С. Умецкай пачынаецца з сярэдзіны 1960-х гг., калі яна вырашае займацца дысертацыйнай працай і паступае ў завочную аспірантуру пры Інстытуце гісторыі АН БССР. Даследчыца скрупулёзна выяўляла і вывучала неабходныя матэрыялы ў архівах і бібліятэках Беларусі, Літвы, Расіі, Украіны. Пэўнымі адкрыццямі ў гісторыі кнігі Беларусі становяцца такія работы Яўгеніі Сяргееўны, як «"Месячник полоцкий" – первый журнал дореволюционной Белоруссии» (1972), «Издательская деятельность Витебского центрального архива древних актов (1871–1906)» (1974), «Из истории книгоиздательской деятельности в г. Полоцке в первом тридцатилетии XIX в.» (1975), «Цензурно-правовое положение книги в Белоруссии (1800–1832 гг.)» (1975).

У 1977 г. Я.С. Умецкая паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю па тэме «История книгопечатания в Белоруссии в первой трети XIX ст. (1801–1832 гг.)». Дзякуючы знаходкам Я.С. Умецкай беларускае кнігазнаўства ўзбагацілася першымі даследаваннямі, у якіх па-новаму раскрываўся свет кніжнай культуры Беларусі XIX ст.: асвятляліся пытанні прыватнага і «казённага» кнігадрукавання, распаўсюджвання кнігі ў Беларусі, даследаваліся крыніцазнаўчыя і гістарыяграфічныя кірункі гісторыі беларускай кнігі.

У 1988 г. Я.С. Умецкай было прысвоена навуковае званне дацэнт. На яе рахунку такія распрацаваныя вучэбныя курсы, як «Сацыяльна-эканамічная бібліяграфія», «Гісторыя бібліяграфіі», «Бібліяграфічная работа ЦБС», «Кнігазнаўства. Гісторыя», «Гісторыя беларускай кнігі». За падрыхтоўку навуковых кадраў яе дзейнасць адзначалася ганаровымі граматамі, а ўклад у развіццё беларускага кнігазнаўства адзначаны медалём Францыска Скарыны (1977).

Яўгенія Сяргееўна Умецкая – гэта сапраўды імя ў гісторыі бібліятэчнага факультэта, яго гонар. Менавіта яна казала, што бібліятэчную прафесію лічыць адной з самых лепшых. І пацвярджала гэта сваёй дзейнасцю як спецыяліста з грунтоўным прафесійным вопытам бібліятэкара і даследчыка, а таксама і вучонага, вядомага ў навуковых колах Беларусі і за яе межамі. За якія б пытанні Яўгенія Сяргееўна не бралася – вучэбныя ці навуковыя, падыход да іх асвятлення заўсёды адрозніваўся глыбінёй і ўзважлівасцю. Дзякуючы гэтаму, а таксама выдатным чалавечым якасцям: адкрытасці і бескарыснасці, Я.С. Умецкая карысталася аўтарытэтам і павагай сярод калег па працы і студэнтаў, якія з удзячнасцю яе ўспамінаюць як выкладчыка, куратара, настаўніка, справу якога прадаўжаюць у галіне развіцця бібліятэчнай справы і беларускага кнігазнаўства.

Калегі, сябры і вучні глыбока смуткуюць і выказваюць спачуванні сям'і і блізкім Я.С. Умецкай.

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*

*Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый*

*Кафедра тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый*

*Бібліятэка і аддзел рэдкіх кніг*



«Бібліятэчны свет», 2016, № 2 (89). Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1223. Падпісана да друку 22.04.2016. Фармат 60x84 1/8. Гарнітура «Helios». Лічбавы друк. Ум. друк. арк. 3,72. Тыраж 1485 экз. Заказ 660. Кошт свабодны.
Выдавец і паліграфічнае выкананне: дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі».
ЛП № 02330/182 ад 30.07.2009.
Пр. Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск.
© «Бібліятэчны свет», 2016